# ВЫКАНАЎЧЫЯ АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ ПЕСЕНЬ ВЕРХНЯДЗВІНСКАГА РАЁНА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Р. М. Скрыпко, А. М. Шугаеў*

*R. Skrypko, A. Shugaev*

*БДПУ (Мінск)*

*Анатацыя.* У артыкуле разглядаюцца выканаўчыя асаблівасці беларускіх народных песень Верхнедзвінскага раёна Віцебскай вобласці, акцэнтуецца неабходнасць вывучэння беларускага фальклору.

*Annotation.* The article deals with executive features of Belarusian folk songs Verhnedvinsk district, Vitebsk region, emphasizes the need to study the Belarusian folklore.

*Ключавыя словы*: народная песня, Верхнедзвінскі раён Віцебская вобласці, фальклор, мелодыя, манера выканання.

*Keywords*: folk song, Verhnedvinsk district, Vitebsk region, folklore, melody, style of performance.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Беларуская музыка ўвайшла ў сусветную культуру як яркая і самабытная з'ява. Каранямі беларуская народная музыка сыходзіць у глыбокую старажытнасць, да вытокаў культуры ўсходніх славян. Беларуская музыка мае самабытныя, яркія і цудоўныя народныя традыцыі.

Знайсці адметныя рысы музыкі беларусаў можна ў абрадавых песнях: калядных, масленічных, жніўных, вясельных і розных іншых, прымеркаваных да важных падзей.

Жанравай багаццем і разнастайнасцю эмацыйнага зместу адрозніваецца беларуская народная музыка. Працоўная грамадская практыка, гістарычныя падзеі, паўсядзённыя бытавыя інтарэсы чалавека і яго асабістыя перажыванні знайшлі адлюстраванне ў шматлікіх музычна-паэтычных жанрах (старажытная працоўная і абрадавая паэзія, песні, звязаныя з гістарычнымі падзеямі і бытавымі з'явамі, песні сацыяльнага пратэсту, лірычныя).

Меладычны змест старадаўніх працоўных і абрадавых песень выяўляе рысы пэўнай стылістычнай агульнасці для ўсёй тэрыторыі рэспублікі. Захаваўшы да нядаўняга часу некаторыя прыкметы, уласцівыя больш ранняга перыяду развіцця музыкі, напрыклад, элементы імправізацыі, песні параўнальна мала падвяргаліся розным музычным уп-

лывам. Песні пазнейшыя (лірычныя, балады, казацкія і інш.) часта нясуць на сабе адбітак мясцовых стылявых асаблівасцяў, індывідуалізацыю вакальнай выканальніцкай манеры.

Гукавой асновай беларускай народнай музыкі з'яўляецца дыятанічны гукарад. У некаторых аднагалосныя песнях, асабліва старадаўніх, назіраюцца выпадкі значна большай дэталізацыі гукавой шкалы. Ладавая і рытмічная характарыстыка народнай музыкі вельмі разнастайныя як па сваіх гістарычных тыпах, так і па выразным магчымасцям.

Асновай музычнай структуры беларускай народнай песні служыць двухчасткавая форма, якая ўзнікла на аснове двухрадковай страфы старадаўняй апавядальнай паэтычнай формы. Шматгалоссе ў народнай музыцы беларусаў мае ў асноўным падгалосачны характар і найбольш часта сустракаецца ў лірычнай песні.

Песенны фальклор Віцебшчыны адрозніваецца ад фальклору іншых куткоў Беларусі. У асноўным гэтыя адрозненні звязаны з “шыратой выканання” песні, з моцным гучаннем і добраасэнсаваным тэкстам. Але можна сустрэць і песні с аднолькавым матывам, але розным тэкстам. Н-д: песня “Зялёная вішня” з Брэсцкай вобласці па матыву аднолькавая з песняй “Зялёны дубочак” з Верхнядзвінскага краю Віцебскай вобласці.

*“Зяленая вішня з пад корня ня вышла*
*Не дай мяне маці дзе я не прывычна.”*

Такія словы спяваліся ў песні Брэсцкай вобласці.

*“Зялены дубочак, шырокі лісточак*
*Куды вецер вее туды голле гнуцца.”*

А гэтыя словы былі на Віцебшчыне, але мелодыя песень у розных месцах была аднолькавая.

Спецыфічнымі асаблівасцямі адрозніваліся сіроцкія песні на Віцебшчыне, яны выконваліся інакш, чым у іншых рэгіёнах Беларусі. Па сэнсе і манеры выканання яны былі падобныя да песень рускага фальклору. Гэта тлумачыцца перш за ўсё тэрытарыяльнымі прычынамі: побач з Віцебскай вобласцю знаходзіцца Расія (гарады Смаленск, Себеж, Пскоў).

*“Шырокая дарожанька*
*Там сіротка хадзіла*
*Ды у Бога долю прасіла.”*

Песня выконвалася без галашэння, але жалобна і з вялікім смуткам. Тым часам на Палессі сіроцкія песні выконваліся больш экспрэсіўна – з галашэннем і плачам. Такія песні спявалі у час сумы, або пры пахаванні ці пасля. Час

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выкананння песні меў вялікае значэнне, парушаць гэтыя нормы было забаронена. Напрыклад, лічылася, што калі заспяваць песню "Салавейка лугавы" на вяселлі, то ў маладых не будзе шчасця, а таму песня спявалася толькі па сумнай прычыне (напрыклад, пры пахаванні чалавека). Выконвалася таксама працяжна, але ужо з галашэннем.

У народна-песеннай манеры выканання таксама прысутнічала своеасаблівая імправізацыйныя і метрарытмічная свабода; вялікую ролю ў беларускай мелодыцы Верхнедзвінскага раёна мелі прыём вібрата і глісандзіраванне меладычных ліній. Да апошняй чвэрці XIX стагоддзя выкананне народных песень было пераважна аднагалосныя. Найстаражытным стылем народных шматгалосных спеваў з'яўляюцца антыфонныя спевы, якія да гэтага часу існуюць у Віцебскай вобласці (песні «У нас сягоння Купалачка», «У Кузьмовым дварочку», «Купала, Купала, дзе ты прабувала?», «Чырвоная ружа» [3]). У народным шматгалосных спевах прысутнічае манера спеваў з «бурдонам», калі мелодыю вядуць найбольш галасістыя выканаўцы, астатнія ж «цягнуць» адзін гук [1].

Народная песня суправаджала чалавека ўсё жыццё – у поле, у шляху, на вайне. Усе акалічнасці жыцця адлюстраваны ў народных песнях, якія нясуць у сабе павучальны характар. Народныя песні пераходзілі з пакалення ў пакаленне і дайшлі да нашых часоў, а значыць яны ўвабралі ў сабе маральныя нормы і правілы, уяўленні чалавека пра свет і наваколле, пра самаго сябе і сваё месца ў сусвеце. Праз вывучэнне народных песень можна даведацца пра гісторыю нацыі і спазнаць асаблівасці нацыянальнага характару. У цэлым, народная культура першапачаткова нясе ў сабе маральнасць, эстэтыку, элементы народнай мудрасці і светаразумення. Вывучэнне і выкарыстанне фальклору дае магчымасць развіваць здольнасці асваення і разумення каштоўнасці культуры, пераняць духоўны і маральны вопыт пакаленняў. Выкананне і слуханне народных музычных твораў садзейнічае развіццю асацыятыўнага, вобразнага мыслення, творчага патэнцыялу, фармаванню індывідуальнасці. Зварот да вытокаў народнага мастацтва накіравана таксама на адраджэнне пераемнасці пакаленняў, патрыятычных настрояў, маральных асноў, якія характарызуюцца спалучэннем агульначалавечага і этнічнага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### *Літаратура*


1. Густова, Л. Музыкально-фонетические связи церковного и фольклорного пения в белорусской культуре / Л. Густова // Западная Русь. – 14 мая 2011 года. – Режим доступа : https://zapadrus.su/zaprus/strbel/340-2011-05-14-11-58-33.html. – Дата доступа : 20.03.2018.
2. Елатов, В. И. Ритмические основы белорусской народной музыки / В. И. Елатов. – Минск: Наука и техника, 1966. – 220 с.

3. Калацэй, В. Купалле на «Берагіні» / В. Калацэй, Т. Пладунова [Электронны рэсурс] // Берагіня : Пяты Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва (2006-2008) / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь [і інш.]. – Мінск, 2008. – С. 260-268. – Рэжым доступа : http://repository.buk.by/bitstream/handle/123456789/ 14843/%D0%9A%D1%83%D0%BF%D0%B0%D0%BB%D0%BB%D0%B5%20%D0%BD%D0%B0%20%D0%91%D0%B5%D1%80%D0%B0%D0%B3%D1%96%D0%BD%D1%96.pdf?sequence=1&isAllowed=y. – Дата доступа : 20.03.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ